



# Мая Беларусь

Анастасія Мельнічак

*Любімы мой край беларускі,*
*Азёры, раўніны, палі,*
*Блакітнае неба над гаем*
*І гоман птушыны ўдалі…*

*Сцяжыначка стужкаю ўецца*
*Між сосен, бяроз і ялін,*
*І кроплі чырвонай сунічкі*
*Глядзяць на мяне з-пад асін.*

*Люблю я лясы і паляны,*
*Ветлівы, бярозавы гай*
*І птушак, якія спяваюць*
*Мне песню пра родны наш край.*

*Званочак галоўкай ківае,*
*Салоўка цудоўна пяе:*
*Усё гэта – мой край беларускі,*
*Я сэрца дарую табе!*

*Любімы мой край беларускі!*
*Люблю я цябе ўсёй душой!*
*І сэрца маё гучна б'ецца,*
*Як бачу бусла над ракой.*

*І хай нехта марыць пра Захад,*
*А нехта імчыць на Усход…*
*Навечна з табой застануся,*
*Мой беларускі куток!*